***І. А. Алексніна,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт*

# ДА ПЫТАННЯ АНАЛІЗУ РЭПЕРТУАРНАЙ ПРАПАНОВЫ НАРОДНЫХ ТЭАТРАЎ САВЕЦКАГА ПЕРЫЯДУ: НА ПРЫКЛАДЗЕ АМАТАРСКІХ КАЛЕКТЫВАЎ ЗАХОДНЯГА ПААЗЕР'Я

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Агульная колькасць найбольш значных пастановак, створаных аматарамі тэатральнага мастацтва Заходняга Паазер'я больш як за саракагадовы перыяд (з 1946 г.), якія атрымалі высокую ацэнку гледачоў і журы конкурсаў, аглядаў, дэкад і прафесіянальнай крытыкі, складае 146 спектакляў. Пераважная большасць з іх – сцэнічныя версіі твораў рускіх класікаў, савецкіх аўтараў і драматургаў былога СССР (78 твораў, або 53,5%). Даволі многа ставілася ў гэты час і нацыянальнай драматургіі, як класічнай, так і сучаснай (61 твор, або 42%). Пастаноўкі па творах замежнай драматургіі склалі толькі 7, або каля 4,5%. Гэта было абумоўлена і тым, што шэраг аўтараў (напрыклад, той жа С. Мрожак) не друкаваліся на рускай мове амаль да другой паловы 1980-х гг. (Гісторыя беларускага тэатра: у 3 т. / гал. рэд. У. І. Няфёд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – Т. 3, кн. 1. – 327 с.).

Сярод твораў рускіх класікаў, на падставе якіх аматарамі рэгіёна паказана 17% спектакляў, папулярнасцю карысталіся такія аўтары, як А. П. Чэхаў («Юбилей», «Медведь», «Злоумышленник», «Предложение» – былі пастаўлены ва ўсіх тэатрах рэгіёна); М. В. Гогаль («Ревизор», «Женитьба» – Докшыцы і Браслаў); Д. І. Фанвізін («Недоросль» – Міёры); І. Салагуб («Беда от нежного сердца» – Браслаў), А. М. Астроўскі («Поздняя любовь» – Паставы і Браслаў; «Бедность не порок» – Паставы; «Без вины виноватые» – Докшыцы; «Не все коту масленница» – Браслаў; «Свои люди – сочтемся» – Докшыцы, Міёры). Дарэчы, менавіта творы А. Астроўскага складаюць амаль палову паказаў класікі – 9%.

Сучасная тэматыка ў народных тэатрах Заходняга Паазер'я характарызуецца даволі багатай жанравай палітрай, прадстаўлена драматургіяй рускіх савецкіх аўтараў і пісьменнікаў блізкага замежжа. Такія спектаклі, пастаноўкі якіх былі ўвасоблены на рускай мове, склалі 35,5%. Згодна з тэматыкай і абсягам праблем,

рэгіянальны рэпертуар народных тэатраў савецкага перыяду можна ўмоўна падзяліць на дзве асноўныя часткі. Да першай мэтазгодна аднесці п'есы, прысвечаныя рэвалюцыйным падзеям, тэме грамадзянскай вайны, барацьбе за ўсталяванне савецкай улады, а таксама творы, прысвечаныя мужнасці і гераізму народа ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Сярод іх – спектаклі «Площадь цветов» В. Ільенкава, «Как закалялась сталь» паводле М. Астроўскага, «Ровесники грозы» Ц. Саладара, «Голосеевский лес» В. Сабко (Браслаўскі народны тэатр); «Любовь Яровая» К. Транёва, «Бронепоезд 14-69» Ус. Іванава, «Солдатская вдова» В. Анкілава (Докшыцкі народны тэатр); «Разлом» Б. Лаўранёва, «Юность отцов» Б. Гарбатава, «Верность» В. Бергольц, «Берегите живых сыновей» А. Сафронава, «Иголка и штык» Г. Аліева (Пастаўскі народны тэатр); «Барабанщица» А. Салынскага (Міёрскі народны тэатр) і «Отважные сердца» А. Эвальда (Браслаўскі і Пастаўскі народныя тэатры).

Большая ж частка рускамоўных твораў, што ставіліся ў тэатрах рэгіёна, прысвечана сучаснаму жыццю, грамадскім праблемам, маралі і духоўнасці: складаюць прыкладна 32,9% ад агульнай колькасці п'ес аўтараў-сучаснікаў. Значным поспехам карысталіся творы «Неравный бой» В. Розава, «Чудесный сплав» У. Кіршона, «Ленинградский проспект» І. Штока, «Лошадь Пржевальского» М. Шатрова, «Комиссар милиции» П. Данілава, «Нюрка-разбойница» А. Давідчава, «Транзит», «Прощай» Л. Зорына (Паставы); «Приговор» М. Варфаламеева, «Девочка и апрель» Т. Ян, «Провинциалки» Я. Стэльмаха (Браслаў); «20 лет спустя» М. Святлова, «История с метранпажем» А. Вампілава, «Сосед из тридцать четвертой» І. Лёвіна (Міёры); «Калиновая роща», «Платон Кречет» А. Карнейчука, «Дело ее жизни» А. Гутковіча і Ф. Казоўскай, «Девочка с веснушками» Э. Успенскага (Браслаўскі і Пастаўскі народныя тэатры); «Таня», «Шестеро влюбленных» А. Арбузава, «До третьих петухов» В. Шукшына (Браслаўскі і Докшыцкі народныя тэатры).

Значную ролю ў рэпертуары тэатраў Заходняга Паазер'я адыгрываюць п'есы нацыянальнай драматургіі і інсцэніроўкі па празаічных і паэтычных творах сучасных аўтараў.

Беларуская класіка, якая характарызуецца глыбінёй, дакладнасцю выяўлення адметных асаблівасцей нацыянальнага характару, выкарыстаннем вопыту сінтэтычных у мастацка-эстэтычным сэнсе «беларускіх вечарынак», складае 23% з ліку твораў, паказы якіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адбыліся на беларускай мове. Пераважная колькасць пастановак – невялікія па памерах, нескладаныя для акцёрскага ўвасаблення, насычаныя народным гумарам, добра зразумелыя ў местачкова-вясковым асяроддзі «камедыйкі» «Міхалка» бр. Далецкіх, «Мікітаў лапаць» М. Чарота, «Конскі партрэт», «Збянтэжаны Саўка» Л. Родзевіча, «Модны шляхцюк» К. Каганца. Такія паказы адбываліся ў кожным народным тэатры рэгіёна.

Сярод шматактовай драматургіі айчыннай класікі не губляюць папулярнасці ў аматараў і гледачоў творы В. Дуніна-Марцінкевіча «Залёты» (Браслаў), «Пінская шляхта» (Браслаўскі, Докшыцкі народныя тэатры), «Ідылія» (Докшыцы); Я. Коласа «Сымон-музыка» (Міёры); Я. Купалы «Прымакі», «Паўлінка» (Браслаўскі, Докшыцкі і Пастаўскі народныя тэатры) і К. Крапівы «Пяюць жаўрукі» (Браслаў); «Хто смяецца апошнім» (Докшыцы, Браслаў); «Партызаны» (Докшыцы).

Больш багата ў жанравых і тэматычных адносінах прадстаўлены ў рэпертуары народных тэатраў рэгіёна ў 1960–1980 гг. беларускія творы на сучасную тэму. Такія паказы складаюць 73%. Пры гэтым найбольшай папулярнасцю карыстаюцца творы А. Макаёнка, драматурга, які па значнасці ўкладу ў развіццё нацыянальнага тэатральнага мастацтва справядліва лічыцца класікам. Спектаклі па яго творах складаюць амаль 28% з беларускамоўнай драматургіі, якая ўбачыла жыццё на сцэнах рэгіёна. Тут ставяцца «Выбачайце, калі ласка!», «Зацюканы апостал», «Таблетку пад язык» (Браслаў), «Трыбунал» (Докшыцы, Браслаў), «Лявоніха на арбіце» (Міёры), «Верачка» (Паставы). Сярод іншых аўтараў – І. Шамякін («Не верце цішыні»), Я. Рамановіч («Дзве сяброўкі»), А. Маўзон («Пад адным небам»), А. Матукоўскі («Мудрамер», «Апошняя інстанцыя»), В. Вольскі («Несцерка»), У. Бутрамееў («Як Несцерка па свеце гуляў»), А. Петрашкевіч («Адкуль грэх?»), М. Гарулёў («Сябры і ворагі»), К. Губарэвіч («Першы ўрок»), У. Сауліч («Сабака з залатым зубам»), А. Дудараў («Радавыя», «Купальская ноч»), М. Арахоўскі («Машэка»).

У постсавецкі перыяд узрастае неабходнасць пастановак сучасных твораў, якія адлюстроўвалі б жыццёвыя і грамадскія праблемы, выхоўвалі асобу гледача. Неабходна новая, сучасная беларуская п’еса, нацыянальная не толькі па моўных характарыстыках, але і па глыбіні выяўлення псіхалогіі беларусаў, рыс нацыянальнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характару. Такія праблемы паўстаюць як перад дзеячамі прафесійнага мастацтва, так і перад народнымі тэатрамі краіны. Рэжысёры самадзейных калектываў рэгіёна часткова запаўняюць рэпертуарную нішу шляхам стварэння паказаў паводле ўжо вядомых гледачу твораў Л. Родзевіча, М. Чарота, К.Каганца, аб’ядноўваючы іх агульным тэматычна-падзейным стрыжнем. Паказы пад назвамі «Смяяцца не грэх», «Ажаніцца не журыцца» адбыліся ў Паставах, Браславе і Докшыцах.

Акрамя таго, у спробах аднавіць рэпертуар сучаснай п’есай кіраўнікі народных тэатраў ствараюць і ўвасабляюць інсцэніроўкі празаічных і вершаваных твораў В. Быкава «Пайсці і не вярнуцца» (Браслаў, Міёры), Г. Бураўкіна «Хатынскі снег» (Міёры).

Паспяховымі можна лічыць і стварэнні спектакляў паводле п’ес, напісаных самімі ўдзельнікамі і кіраўнікамі народных тэатраў. На аснове народных жартаў, баек, анекдотаў артысты Докшыцкага народнага тэатра В. Галавач і Ф. Палачанін напісалі інтэрмедыю «Мужык і пан», не раз паспяхова паказаную на самадзейнай сцэне. Апошні праявіў сябе і як аўтар яшчэ трох п’ес: «Расплата за нелюбоў», «Санаторная песня», «Кветкі дзяцінства». Рэжысёр народнага тэатра г. Браслава І. Крот ставіць свае п’есы «Мужчына за грошы» і «Абраз».

Замежныя драмы пачынаюць ставіць у народных тэатрах рэгіёна толькі ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. У рэпертуары ўключаліся і спектаклі паводле замежных аўтараў (М. Мітровіча, П. Мерымэ, С. Мрожака). Адметным у мастацка-эстэтычных адносінах быў спектакль Докшыцкага народнага тэатра «Брыльянт» Е. Пшэздзецкага. Гэты ж калектыў стварае сцэнічны паказ паводле іспанскага драматурга Г. Лоркі «Чароўная башмачніца» ў перакладзе на беларускую мову, які зрабіў Ф. Палачанін.

Такім чынам, на аснове нават невялікага аналізу рэпертуару народных тэатраў заходняй часткі Беларускага Паазер’я можна сцвярджаць, што:

1. Рэпертуар аматарскіх тэатраў складаецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу, згодна з мэтамі і задачамі дзейнасці калектываў.

2. Аснову рэпертуара складаюць мастацкія творы, даступныя і зразумелыя жыхару глыбінкі.

3. Лідзіруючую ролю ў рэпертуары народных тэатраў займаюць творы рускіх класікаў і савецкіх аўтараў. Творам нацыянальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

драматургіі надаецца таксама дастатковая ўвага, але тут выяўляецца значны недахоп сучаснай беларускай п’есы, таму некаторыя кіраўнікі тэатраў вымушаны самі ствараць для сваёй трупы драматычныя творы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ